# Першыя Шчорсаўскія чытанні

**У Год кнігі ў гістарычным мястэчку Шчорсы стартаваў новы бібліятэчны праект. Першыя Шчорсаўскія чытанні арганізаваны Навагрудскім райвыканкамам, Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкай імя Я.Ф. Карскага, кафедрай гісторыі Беларусі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы і Навагрудскай цэнтральнай раённай бібліятэкай. Тэма — «Развіццё бібліятэчнай справы на Гродзеншчыне: дзяржаўныя і прыватныя кнігазборы».**

Гістарычнай падзеяй для ўсёй Беларусі назваў гэтыя чытанні сталічны прафесар Энгельс Дарашэвіч. І сапраўды, Гарадзеншчына, Наваградчына былі буйнейшымі і значнымі цэнтрамі развіцця бібліятэчнай справы, якая мае на беларускіх землях 800-гадовую гісторыю. Першыя бібліятэкі ўзнікаюць яшчэ ў часы Гарадзенскага княства. І менавіта ў Гродне былі заснаваны і першая навуковая медыцынская бібліятэка (1775), і першая публічная бібліятэка (1830).

Славіліся ў Еўропе і магнацкія бібліятэкі з Гарадзеншчыны. Буйнейшыя сярод іх — бібліятэкі Храптовічаў і Сапегаў. Прыватны кнігазбор Сапегаў быў другім па велічыні на Беларусі (пасля бібліятэкі Радзівілаў). Стваральнікамі гэтых бібліятэк былі першыя асобы ў Вялікім Княстве Літоўскім: канцлер ВКЛ Леў Сапега, дзяржаўны, гаспадарчы, навуковы і культурны дзеяч ВКЛ Яўхім Храптовіч.

Таму нядзіўна, што мэта першых Шчорсаўскіх чытанняў, у якіх удзельнічалі навукоўцы, краязнаўцы, супрацоўнікі музеяў і бібліятэк з Беларусі і Польшчы, — асэнсаваць значэнне і вартасць гістарычных кнігазбораў Навагрудчыны і ў цэлым Гродзеншчыны, выявіць асаблівасці іх фарміравання, захавання і даследавання ў кантэксце кніжнай культуры і, несумненна, ушанаваць найбагацейшую бібліятэку Храптовічаў. Таксама на чытаннях вырашана хадайнічаць перад мясцовымі ўладамі аб наданні імя Яўхіма Храптовіча Навагрудскай цэнтральнай раённай бібліятэцы.

Шчорсаўскія чытанні мяркуецца зрабіць традыцыйнымі і праводзіць раз на два гады. Тэма наступных чытанняў — манастырскія і царкоўныя бібліятэкі на Гродзеншчыне.

**Любоў ТУРМАСАВА, загадчык аддзела краязнаўства Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага**

Звязда.-2012.-5 чэрвеня.-С.7